**Назва ТВП:** Галубіцкая пушча







© С. Левый

**Код:** BY004

**Геаграфічныя каардынаты:** 55°00' N 28°03' E

**Адміністрацыйная прыналежнасць:** Віцебская вобласць: Глыбоцкі раён, Докшыцкі раён

**Плошча:** 20939 га

**Крытэрыі:** B2

**Нацыянальны прыродаахоўны статус:** частка тэрыторыі ландшафтна-гідралагічны заказнік мясцовага значэння «Галубіцкая пушча» (6734 га)

**Міжнародны прыродаахоўны статус:** ТВП рэгіянальнай значнасці

## Агульнае апісанне:

Галубіцкая Пушча ўяўляе сабой мазаічнае спалучэнне леса-балотных, лугавых, балотных і лясных масіваў, а таксама буйных натуральных вадаёмаў, якія знаходзяцца ў водазборным басейне вярхоўяў ракі Бярэзіна. Лясамі пакрыта 60% тэрыторыі, 18% займаюць балоты. Ядром заказніка з'яўляюцца масівы сфагнавых і пераходных балот, якія размешчаны ў яго паўночнай частцы. Лясы ў асноўным прадстаўлены сярэднеўзроставымі хвойнікамі, у меншай ступені ельнікамі,

чорнаалешнікамі, бярэзнікамі. Вельмі рэдка сустракаюцца фрагменты шыракаліставых лясоў.

Галубіцкая Пушча адносіцца да вярхоўяў ракі Бярэзіна, якая з'яўляецца асноўнай воднай артэрыяй заказніка. Даўжыня ракі ў межах ТВП складае 40 кіламетраў. Рэчышча яе вельмі звілістае і часта разгалінаванае, багатае на пратокі і невялікія пясчаныя астравы, якія затапляюцца ў паводку. Рака Бярэзіна на тэрыторыі заказніка працякае праз пойменнае возера Медзазол. Другое буйное возера Межужол размешчана сярод сфагнавых балот і звязана з Бярэзінай меліяратыўнымі каналамі і ракой Чарніца. Вада гэтага возера характарызуецца нізкай мінералізацыяй і высокай колернасцю. Возера зарастае слаба. У выніку правядзення асушальнай меліярацыі і торфараспрацовак у заходняй і часткова ў паўднёва-усходняй частках заказніка гідралагічныя ўмовы тэрыторыі значна трансфарміраваліся.

З гаспадарчай дзейнасці пераважае лесакарыстанне. Тарфяныя месцанараджэнні на тэрыторыі Галубіцкай Пушчы з'яўляюцца адной з асноўных у раёне баз здабычы прамысловай сыравіны. Мясцовыя жыхары на тэрыторыі заказніка збіраюць ягады і грыбы, займаюцца паляваннем і рыбнай лоўляй.

## Асноўныя біятопы:

Лясы – 60%, верхавыяі пераходныя балоты – 18%, торфараспрацоўкі – 15%, азёры – 2%, іншыя землі – 5%.

## Птушкі:

На тэрыторыі сустракаецца 192 віда птушак, з якіх 24 занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.

У заказніку гняздуюцца чапля-бугай *Botaurus stellaris*, звычайны гогаль *Bucephala clangula*, малы арлец *Aquila pomarina*, арол-вужаед *Circaetus gallicus*, залацістая сеўка *Pluvialis apricaria*, даўгахвостая кугакаўка *Strix uralensis*. На ТВП значная колькасць цецярука *Tetrao tetrix* - 70-100 пар, глушца *Tetrao urogallus* - 30-40 самцоў і звычайнага гогаля *Bucephalaclangula* 20-40 пар. Яўчэ захавалася невялікая папуляцыя белай курапаткі, але яе колькасць значна паменшылася. Адзначаны таксама чорнаваллёвы гагач *Gavia arctica*, вялікая белая чапля *Egretta alba* і звычайны зімародак *Alcedo atthis*.

ТВП “Галубіцкая пушча” мае значэнне для захавання скапы *Pandionhaliaetus* (5-

7 пар).

## Іншыя групы жывел:

З млекакормячых адзначана больш за 40 відаў.

## Стан рэдкіх відаў птушак:

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2005-2010) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Гусь шэрая *Anser anser* | мг | + | 2005-2010 | П | | |
| Пардва *Lagopus lagopus* | гн | + | 2005-2010 | П | ↓ | |
| Гагач чорнаваллёвы *Gavia arctica* | мг | + | 2005-2010 | П | | |
| Коўра шэрашчокая *Podiceps grisegena* | мг | + | 2005-2010 | П | | |
| Чапля-бугай *Botaurus stellaris* | гн | + | 2005-2010 | П | | |
| Чапля вялікая белая *Casmerodius albus* | гн? | 4-5 п | 2005-2010 | П | ↑ | |
| Бусел белы *Ciconia ciconia* | гн | 3-4 п | 2005-2010 | Д | ↔ | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2005-2010) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla* | гн? | 0-1 п | 2005-2010 | П | | |
| Арол-вужаед *Circaetus gallicus* | гн | 3-4 п | 2005-2010 | Д | ↔ | |
| Малы арлец *Aquila pomarina* | гн | 5-6 п | 2005-2010 | Д | ↓ | |
| Арол-маркут *Aquila chrysaetos* | гн? | 1 п | 2005-2010 | Д | ↔ | |
| Скапа *Pandion haliaetus* | гн | 5-7 п | 2005-2010 | Д | ↔ | B2 |
| Сокал-пустальга *Falco tinnunculus* | гн | 6-8 п | 2005-2010 | Д | ↓ | |
| Сокал-дрымлюк *Falco columbarius* | гн | 3-4 п | 2005-2010 | Д | | |
| Сокал-кабец *Falco subbuteo* | гн | 5-6 п | 2005-2010 | Д | ↔ | |
| Журавель шэры *Grus grus* | гн | 10-14 п | 2005-2010 | Э | ↑ | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2005-2010) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сеўка залацістая *Pluvialis apricaria* | гн | 10-15 п | 2005-2010 | Э | ↔ | |
| Пугач *Bubo bubo* | гн | 1-2 п | 2005-2010 | П | ↔ | |
| Сычык вераб'іны *Glaucidium passerinum* | гн | 6-7 п | 2005-2010 | Э | ↔ | |
| Кугакаўка даўгахвостая *Strix uralensis* | гн | 8-9 п | 2005-2010 | Э | ↔ | |
| Звычайны зімародак *Alcedo atthis* | гн | 5-7 п | 2005-2010 | Э | ↔ | |
| Жаўна зялёная *Picus viridis* | гн | + | 2005-2010 | П | | |
| Дзяцел жоўтагаловы *Picoides tridactylus* | гн | + | 2005-2010 | П | | |

## Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Звяры: буры мядзведзь *Ursus arctos*, барсук *Meles meles*, еўрапейская рысь *Felis linx*.

Насякомыя:тарфянікавая жаўтушка*Coliaspalaeno.*

Расліны: адзначана каля 40 рэдкіх відаў; сярод іх такія як: баранец звычайны *Huperziaselago*

, лікападыела заліўная *Lycopodiellainundata*, касач сібірскі *Irissibirica*, шпажнік чарапіцавы *Gladiolusimbricatus*, аднацветка аднакветкавая *Monesesuniflora*, пярэсна еўрапейская *Trolliuseuropaeus*, пуханос альпійскі*Baeothryonalpinum*, лінея паўночная *Linnaeaborealis*, ладдзян трохнадрэзаны *Corallorhizatrifida*, вярба чарнічная *Salixmyrtilloides*, бяроза карлікавая *Betulanana*, журавіны дробнаплодныя *Oxycoccusmicrocarpus*, марошка прысадзістая *Rubuschamaetorus*, кізільнік чарнаплодны *Cotoneastermelanocarpus*.

## Пагрозы:

Забруджванне навакольнага асяроддзя. Асноўнай крыніцай забруджвання ракі Бярэзіна з’яўляецца горад Докшыцы, які не мае адпаведных ачышчальных пабудоў.

Меліярацыя і торфараспрацоўка. Галоўным фактарам парушэння экалагічнага баланса ў раёне заказніка, з'яўляюцца торфараспрацоўкі, якія праводзяцца тут на працягу апошніх 30 гадоў. У перспектыве плануецца ахапіць распрацоўкамі ўвесь масіў верхавога балота. Гэта прывядзе да поўнага знішчэння прыроднага комплекса Галубіцкая Пушча і, несумненна, акажа негатыўны ўплыў на стан ракі Бярэзіна і Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

## Рэкамендацыі па захаванню:

Неабходна пашырыць межы заказніка і спыніць далейшую здабычу торфа. Гэта паслужыць падставай для стабілізацыі гідралагічнага рэжыму вярхоўяў ракі Бярэзіна і Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

## Крыніцы інфармацыі:


Асабістыя паведамленні: Пяцько Г.П.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Іваноўскі У.В., Пяцько Г.П., Ямінскі Б.В.).

Сушко Г.Г., Шкатуло В.В., Борок И.И. Редкие и охраняемые виды насекомых обитателей верховых болот Белорусского Поозерья // Красная книга Республики Беларусь: состояние, проблемы, преспективы: материалы международной научной конференции. – Витебск: УО “ВГУ им. П.М. Машерова”, 2011., с. 171-173.



**Складальнікі :** Пяцько Г.П.


---


* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнэт-рэсурсах, абавязковая*

*спасылка на аўтараў і сайт [iba.ptushki.org](iba.ptushki.org)*